*А. А. Суша*

# БЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТУРА ЭПОХІ БАРОКА НА ПАМЕЖЖЫ ЎПЛЫВАЎ УСХОДУ І ЗАХАДУ

Распаўсюджаным з'яўляецца меркаванне, што беларуская культура эпохі барока мела заходні характар і ў ёй дамінавала заходняя традыцыя. Цалкам з такім палажэннем пагадзіцца складана.

Безумоўна, сувязь з вельмі аддаленай краінай, якой для Беларусі з'яўлялася Візантыя, не была вельмі моцнай, а пасля захопу Канстанцінопаля туркамі была наогул перапынена. Тым не менш беларуская культура захавала свой усходні пачатак, развіваючы які ва ўзаемадзеянні з пачаткам заходнім, сфарміравала ўласную адметнасць і непаўторнасць. Таму, на нашу думку, нельга звязваць перыяд Рэчы Паспалітай у гісторыі беларускай культуры выключна з заходнееўрапейскімі ўплывамі. Прыгадаем хаця б выраб слуцкіх паясоў усходняй стылістыкі і моду на ўсходнія сармацкія строі, кірылічнае кнігавыданне і інш. Варта адзначыць таксама, што большасць насельніцтва Беларусі ў XVI–XVIII стст. належала да хрысціянства ўсходняга абраду (праваслаўныя і ўніяты).

Як адзначае А. Мальдзіс, «у беларускім культурна-грамадскім жыцці яшчэ заставаўся "цэнтрысцкі" плюралізм, у канфесійным жыцці – "цэнтрысцкая" (незвычайная і для Усходу, і для Захаду) цярпімасць да іншаверцаў. У адрозненне ад Маскоўскай дзяржавы, вярхоўная (вялікакняжацкая) улада была тут абмежавана законам (Літоўскім статутам), дапаўнялася выбарнымі органамі. Гарады тут кіраваліся магдэбургскім правам, а грамадзяне мелі свабоду перамяшчэння, у тым ліку ў Заходнюю Еўропу. Усё гэта прываблівала сюды інтэлектуальную эліту як з Усходу, так і Захаду. Яе прадстаўнікі прыязджалі на беларуска-літоўскія землі (у Вільню, Полацк, Нясвіж, Заблудаў) не ў пошуках заробку, а свабоды (Курбскі, Фёдараў) – каб свабодна тварыць… Гэта вяло да сінтэзу, спараджала сапраўдныя мастацкія каштоўнасці» [4, с.7–8].

XVII–XVIII стст. у Беларусі – гэта эпоха панавання стылю барока. Ён прыйшоў з Захаду, але вельмі лёгка прыжыўся на мясцовай глебе і аформіўся ў самабытны напрамак – «віленскае барока», у якім можна знайсці шэраг усходніх элементаў [3, с.68–69; 4, с.8–9]. Барочны сармацкі партрэт чэрпаў выяўленчыя сродкі і з іканапісу, і з твораў еўрапейскіх майстроў [7, с.209]. Сінтэз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заходніх і ўсходніх традыцый мы можам бачыць і ў скульптуры [4, с.8–9].

Перапрацоўка ў заходнім стылі візантыйскай іканаграфіі назіраецца і ў гравюры. І гэта не выпадкова: побач з мясцовымі мастакамі ў Беларусі ў эпоху барока працавалі замежныя гравёры [7, с.208–209]. Спалучэнне ўсходніх і заходніх рыс мы бачым у ілюстрацыях да куцеінскіх (праваслаўных) і супрасльскіх (грэка-каталіцкіх і стараверскіх) выданняў, у творах А. і Л. Тарасевічаў, якія працавалі таксама ў Расіі і Украіне, магілёўскіх майстроў М. і В. Вашчанкаў, Ф. Ангілейкі.

Узаемадзеянне ўсходніх і заходніх традыцый мела месца таксама і ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве (урэцкае і налібоцкае шкло), слуцкія паясы, карэліцкія габелены [4, с.10].

Разам з езуітамі з Захаду ў Беларусь прыйшоў школьны тэатр, які досыць хутка атрымаў распаўсюджанне таксама ва ўніяцкай, у грэка-каталіцкай і праваслаўнай цэрквах. Вельмі яркім быў сінтэз традыцый Усходу і Захаду ў літаратурным жыцці Беларусі XVII–XVIII стст. Жыхары Беларусі таго часу пісалі на беларускай, польскай, царкоўнаславянскай, лацінскай, яўрэйскай і іншых мовах. Творы беларускага пісьменства той пары нярэдка належаць дзвюм або тром суседнім літаратурам. Барочная літаратура моцна з’яднала беларускую культуру з культурамі еўрапейскіх народаў, а таксама дзякуючы такім асобам, як С. Полацкі, А. Белабоцкі, С. Собаль, І. Труцэвіч, Г. Каніскі, аказала значны ўплыў на культуру Расіі і Украіны.

Сведчаннем таго, што беларуская культура эпохі барока не адышла ад сваіх усходніх пачаткаў, з’яўляецца актыўная дзейнасць многіх беларускіх культурных дзеячаў у Расіі ў XVII–XVIII стст. Там яны заклалі пачаткі барочнага мастацтва Расіі, стварылі багаты пласт культуры, сапраўдныя шэдэўры рускага мастацтва. Гэтая багатая спадчына лёгка ўлілася ў рускі культурны кантэкст, амаль адразу пачала ўспрымацца як свая, уласная, бо была блізкай па сваім паходжанні, зразумелай для прадстаўнікоў рускай культуры.

Беларуская культура XVII–XVIII стст., незалежна ад канфесіянальнай прыналежнасці яе творцаў і носьбітаў, несла ў сабе рысы і заходняга, і ўсходняга еўрапейскіх макрарэгіёнаў.

Культуратворчая дзейнасць праваслаўнай царквы ВКЛ не толькі абапіралася на ўсходнія традыцыі, але нязменна была звязанай з заходнімі культурнымі ўплывамі. Многія праваслаўныя іерархі часцей карысталіся польскай мовай, чым старабеларускай або

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

царкоўнаславянскай [5, с.201–205]. У беларускай праваслаўнай царкве ў гэты час захоўваецца імкненне да незалежнасці ад Маскоўскага патрыярхату, а святары працягваюць карыстацца старымі «даніканаўскімі» служэбнікамі, распрацоўваюцца чынапаследаванні таінстваў і розных асвячэнняў для праваслаўных святароў ВКЛ, фарміруюцца спецыфічныя рысы беларускіх праваслаўных свят [2, с.14–15].

У выніку праваслаўныя Маскоўскай дзяржавы нярэдка вінавацілі сваіх жа сабратаў за «лацінства», пабачыўшы ў іх схаваных носьбітаў каталіцтва. Для такіх абвінавачванняў, як бачна, была глеба. Нягледзячы на ідэйныя непаразуменні, у культуратворчым плане праваслаўная царква Беларусі ў XVII–XVIII стст. была вельмі блізкай да царквы грэка-каталіцкай, бо грунтавалася на тых жа даўніх традыцыях творчай перапрацоўкі і заходніх, і ўсходніх культурных уплываў.

Барока, як раней гатычны і рэнесансны стылі, у сваім руху на Усход падпарадкавала сабе таксама мастацтва абедзвюх усходніх цэркваў. Праваслаўныя і грэка-каталіцкія цэрквы пачалі сапернічаць з каталіцкімі храмамі і ва ўнутраным упрыгожанні. Беларускі абраз канца XVI–XVIII ст. (і праваслаўны, і грэка-каталіцкі) спалучае ў сабе не толькі ўсходнія (візантыйскія, усходнеславянскія), але і заходнія (пераважна італьянскія) традыцыі [4, с.9; 7, с.208]. Заходнімі ўплывамі тлумачыцца распаўсюджанне ў праваслаўнай і грэка-каталіцкай цэрквах розных аб’ёмных барочных іканастасаў, якія ўводзілі элементы скульптуры ва ўсходні храм.

Асаблівую ролю грэка-каталіцкай царквы ў паяднанні ўсходніх і заходніх мастацкіх традыцый падкрэсліваюць многія даследчыкі Беларусі, Украіны, Расіі, Польшчы і іншых краін.

Пратэстантызм, які прыйшоў да нас з Захаду, меў значны ўплыў на беларускую культуру і ва ўзаемадзеянні з мясцовай культурнай традыцыяй стварыў багатую мастацкую спадчыну. На думку А. Верашчагінай і А. Гурко, «рэфармацыя ў Беларусі ў сваім абліччы мела нацыянальныя рысы» [2, с.13]. Сведчанне таму – правядзенне набажэнства на беларускай мове, з’яўленне рэлігійнай літаратуры на ёй. Замест ранейшай моўнай дыхатаміі лацінскай мовы і царкоўнаславянскай, якія ў XVI ст. ужо былі мёртвымі мовамі, пратэстантызм звяртаецца да новай «моўнай пары» – польскай і беларускай моў. Заходняму барочнаму стылю, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыйшоў з каталіцкай царквой, пратэстантызм супрацьпаставіў устойлівую мясцовую готыка-рэнесансную традыцыю.

Дзейнасць рымска-каталіцкай царквы несла ў Беларусь заходні культурны ўплыў. Але і яна таксама зазнала сур’ёзныя змены, бо і яна не магла не ўспрымаць уздзеянне ўсходняга хрысціянства, разам з якім суіснавала. Каталіцкая царква пачала выкарыстоўваць беларускую мову ў час набажэнства для тлумачэння слаба зразумелых для беларусаў лацінскіх тэкстаў. Для вернікаў з ВКЛ быў атрыманы дазвол папы рымскага друкаваць кнігі па-беларуску кірыліцай. Па-беларуску праводзілася часам і катэхізацыя [6, с.134–139].

Каталіцкая царква ў Беларусі гэтаксама шанавала многія святыя мясціны і цудатворныя абразы (Жыровіцкі, Віленскі і інш.), шанаваныя праваслаўнай царквой. Прадстаўнікі многіх каталіцкіх родаў часта выдзялялі сродкі на заснаванне і падтрымку не толькі каталіцкіх, але і праваслаўных і грэка-каталіцкіх цэркваў і манастыроў.

Нават прадстаўнікі ордэна езуітаў, якіх вінавацяць у найбольш агрэсіўным распаўсюджанні заходняй культуры ў Беларусі, улічвалі асаблівасці мясцовай культуры. Беларускай мове вучыліся студэнты езуіцкіх навучальных устаноў [1, с.252–253; 6, с.138–139]. Езуіцкія навучальныя ўстановы былі адкрытымі для ўсіх ахвотных, незалежна ад веравызнання, не патрабавалася мяняць веравызнанне і пасля паступлення і заканчэння гэтых устаноў. Адукацыю ў езуітаў атрымалі многія праваслаўныя, як, напрыклад, Сімяон Полацкі. Па сведчаннях гісторыкаў, «…бібліятэкі езуіцкіх калегій, а асабліва Полацкай, былі поўныя рускімі і славянскімі кнігамі, сярод якіх знаходзіліся ўсе багаслужбовыя праваслаўныя кнігі, Чэцці-Мінеі, Пралогі і г. д.» [1, с.227]. Значнае ўздзеянне на храмавае будаўніцтва езуітаў аказалі мясцовыя мастацкія і будаўнічыя традыцыі. На тэатральнай сцэне полацкіх езуітаў знайшлося месца сюжэтам з праваслаўнай гісторыі, што, на думку А. Мальдзіса, «было б немагчыма ні на Захадзе, ні на Усходзе» [4, с.11].

Такім чынам, беларуская культура эпохі барока, на наш погляд, мела шматгранны характар, узбагачалася ўплывамі як з Захаду, так і з Усходу.

1. *Блинова, Т. Б.* Иезуиты в Беларуси: роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т. Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 428 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Верашчагіна, А.* Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць: дапаможнік для настаўнікаў / А. Верашчагіна, А. Гурко. – Мінск: Тэхналогія, 2000. – 158 с.

3. *Габрусь, Т. В.* Абрысы станаўлення стылю барока ў манументальным дойлідстве Беларусі / Т. В. Габрусь // Барока ў беларускай культуры і мастацтве. – 2-е выд. – Мінск, 2001. – С. 65–80.

4. *Мальдзіс, А.* Беларуская культура барока як пасрэдніца паміж заходнеславянскім і ўсходнеславянскім светамі / А. Мальдзіс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 20 с.

5. *Марозава, С. В.* Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады) / С. В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 353 с.

6. *Станкевіч, А.* Хрысціянства і беларускі народ: спроба сінтэзу / А. Станкевіч. – Вільня: Беларус. катал. выд-ва, 1940. – 184 с.

7. *Шматаў, В.* Старажытнае беларускае мастацтва ў кантэксце ўсходніх і заходніх традыцый X–XVIII стст. / В. Шматаў // Беларусіка=Albaruthenica: у 2 ч. – Мінск, 1997. – Ч.1. – С. 205–209.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ